раинскому руководству, либо лишив его имеющейся. Такая позиция ФРГ совпадает с подходами других европейских государств, которые поощряют евроатлантический курс президента В. Ющенко, но не желают или не имеют возможности ускорить принятие Украины в НАТО и ЕС.

И, наконец, политика ФРГ в отношении Республики Беларусь после прихода к власти правительства А. Меркель не претерпела существенных изменений. Разногласия между руководством белорусского государства и Германии по целому ряду политических вопросов преодолеть не удалось, более того, обозначились новые проблемы, к примеру, в сфере визовой политики. Вместе с тем, представляется, что в развитии двусторонних отношений имеется значительный потенциал для развития, прежде всего в гуманитарной, культурной и научной сферах.

Учитывая, что новое руководство ФРГ избрало достаточно гибкий курс в отношении всех трех государств, следует использовать эту возможность для поиска новых точек соприкосновения и форм взаимодействия в рамках дальнейшего развития белорусско-германских отношений.

## Польскі грамадскі рух за добрасуседства з Беларуссю

**Хмяліньскі Б.**, *прафесар (Рэспубліка Польшча)*

Даследаванне, праведзенае намі ў апошнія гады, дазваляе сцвердзіць, што ў Польшчы на пачатку 90-х гадоў узнік і на працягу наступных 15 гадоў развіваўся ў якасці важнага фактара грамадска-палітычнага жыцця краіны грамадскі рух за добрасуседства з Рэспублікай Беларусь.

З'яўленню і трывалай жыццяздольнасці згаданага фяномяна паспрыяў шэраг аб'ектыўных фактараў і перадумоў.

Па-першае, абвяшчэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь было вельмі прыхільна сустрэта польскім грамадствам. Адыгралі тут сваю ролю сумеснае гістарычнае мінулае, культурная блізкасць, мноства сямейных і сяброўскіх сувязей паміж грамадзянамі абедзвюх краін. Вялікае значэнне мела і тое, што паўстанне на ўсходняй мяжы Польшчы суверэннай, невялікай і аб'ектыўна дружалюбнай дзяржавы кардынальна ўплывала на геапалітычнае становішча Рэспублікі Польшча. Таму грамадскія настроі на карысць добрасуседскіх адносін з новастворанай дзяржавай былі заканамернымі і шчырымі.

Па-другое, у Рэспубліцы Польшча да пачатку 90-х гадоў склаліся спрыяльныя прававые і грамадска-палітычныя перадумовы для ўзнікнення і дзейнасці неўрадавых арганізацый у сферы міжнародных адносін. Таварыствы і фонды ствараліся польскімі грамадзянамі па сваёй волі, добраахвотна, дзейнічалі самастойна, у рамках Канстытуцыі і заканадаўства РП,

але незалежна ад ідэялагічных прыярытэтаў палітычных партый, знешняй і ўнутранай палітыкі афі цыйных улад . Па розным крыніцам у Польшчы пасля змены ўлады ў 1989 г. і да 2006 г. было ўтворана каля 80 тысяч неўрадавых арганізацый. Адны з іх сышлі з грамадскай сцэны яшчэ да таго, як распачалі працу, іншыя выконвалі свае задумкі і задачы на працягу пэўнага часу, а потым зніклі. Значная частка – гэта дзесяткі тысяч арганізацый – працягвалі сваю дзейнасць увесь перыяд, які даследуецца намі.

Грамадскі рух за добрасуседства з Беларуссю распачалі і ажыццяўлялі польскія грамадзяне, якія кіраваліся патрыятычнымі аргументамі, лічылі, што развіццё супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь адпавядае нацыянальным інтарэсам Польшчы. У значнай частцы гэта былі даўнія прыхільнікі польска-савецкай дружбы, рух актыўна падтрымалі таксама грамадзяне нейкім чынам звязаныя з Беларуссю: этнічна, па паходжанню сваіх бацькоў, прафесіянальна, праз сваякоў альбо сяброў і г.д. Грамадскія арганізацыі − удзельнікі руху не атрымлівалі матэрыяльнай ці палітычнай дапамогі з боку дзяржавы. Гэта сапраўды грамадскі рух.

Доказам таго, што гэта быў аўтэнтычны грамадскі рух, а не асобныя ініцыятывы і мерапрыемствы асобных актораў "трэцяга сектара", служыць удзел у ім у той ці іншай ступені каля 70 грамадскіх арганізацый. Сярод найбольш актыўных можна назваць: Таварыства Польшча − Беларусь, Таварыства супрацоўніцтва Польшча − Усход, Беларускае грамадска-культурнае таварыства, Таварыства польских беларусістаў, Беларускае абъяднанне студэнтаў, Цэнтр славянскай культуры, Таварыства польска-беларуска-расійскага пагаднення, Польска-беларуская гандлёва-прамысловая палата. Гэтыя аргазацыі запісалі ў сваіх статутах прыярытэтнай задачай развіццё польска-беларускіх грамадскіх, навуковых культурных сувязей. Іншыя таварыствы займаліся беларускай праблематыкай час ад часу. Неўрадавымі арганізацыямі за мінулы час было праведзена больш за 8 тысяч публічных мерапрыемстваў: арганізацыйных і справаздачных сходаў, польска-беларускіх перамоў, падпісанняў дагавораў і пратаколаў аб двухбаковым супрацоўніцтве, навуковых канферэнцый, семінараў, літаратурных вечарын, адукацыйных курсаў, кансультацый, выданняў і распаўсюду бюлетэняў, часопісаў, даведачнай і навуковай літаратуры, арганізацый выстаў, канцэртаў, фестываляў, алімпіяд, конкурсаў, урачыстых паседжанняў, аздараўляльных лагяраў, пазнавальных экскурсій. У іх свядома і мэтанакіравана ўдзельнічалі да двух мільёнаў грамадзян Польшчы.

Таварыствы і фонды добрасуседства з Беларуссю абралі два галоўных накірункі сваёй дзейнасці: падтрыманне спрыяльнага маральна-палітычнага клімату для развіцця добрых стасункаў і безпасрэдны ўдзел у пашырэнні польска-беларускіх сувязей ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Грамадскія арганізацыі актыўна падтрымлівалі ўсе дзеянні польскіх улад на карысць гэтага добрасуседства, міждзяржаўныя польска-беларускія дамовы, міжурадавыя паразуменні, пратаколы, іншыя канструк-

тыўныя дамоўленасці. Грамадскія арганізацыі папулярызавалі змест дамоўленасцей праз сродкі масавай інфармацыі, на сваіх мерапрыествах, шляхам вуснай і візуальнай прапаганды, мабілізоўвалі грамадскасць на іх рэалізацыю.

Удзельнікі руху за добрасуседства з Беларуссю каардынавалі альбо спрабавалі каардынаваць свае планы і высілкі з шырокім колам дзяржаўных установ і грамадскіх арганізацый РП: Міністэрствам замежных спраў, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам культуры, камісіямі парламента, мэрамі гарадоў, вышэйшымі і сярэднімі навучальнымі ўстановамі, установамі навукі і культуры, творчымі і прадпрымальніцкімі аб'яднаннямі. У большасці выпадкаў наладжвалася каардынацыя і нават супрацоўніцтва ўдзельнікаў руху са згаданымі ўстановамі і аб'яднаннямі.

Разам з тым, грамадскі рух супрадзейнічаў даступнымі яму сродкамі антыбеларускім кампаніям у польскай прэсе, падтрымліваў станоўчы імідж Беларусі ў польскім грамадстве, перасцерагаў улады і палітыкаў перад пагаршэннем стасункаў паміж суседнімі, гістарычна і культурна блізкімі краінамі і народамі. У часы пагаршэння дыпламатычных і палітычных стасункаў паміж двумя джзяржавамі неўрадавыя арганізацыі – прыхільнікі добрасуседства дэманстравалі альтэрнатыўную маральна-палітычную пазіцыю і актыўна яе папулізавалі. Гэта пазіцыя і актыўныя дзеянні прыносілі плённыя вынікі, яны аказалі значны ўплыў на характар і змест польска-беларускіх адносін. Высілкі польскіх грамадскіх арганізацый паспрыялі таму, што адносіны беларускага грамадства да Польшчы і палякаў засталіся пазітыўнымі, прыхільнымі, добрасуседскімі.

## Взаимоотношения НАТО–ЕС на рубеже XXI века

**Хухлындина Л.М.**, *ФМО БГУ*

Европейские лидеры не перестают утверждать, что Североатлантический альянс остается основой коллективной обороны стран Западной Европы, и будет продолжать играть важную (но не основную) роль в урегулировании кризисов на континенте [1].

Не секрет, что НАТО (и в первую очередь США) весьма озабоченные деятельностью Европейского союза по формированию единой политики в сфере безопасности и обороны, формально приветствовали эти начинания. Как уже отмечалось, на встрече глав государств и правительств стран-членов НАТО в Вашингтоне 24 апреля 1999 г. в целом была выражена поддержка тенденции усиления европейского оборонного потенциала. Вместе с тем, Соединенные Штаты опасаются, что появление у ЕС собст-

[1] Качалин А. Евроармия: уже не миф, но еще не реальность.// Компас. 1999. № 52. С.44.